**Л.М.Рагачова,** *дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ ЯК КІРУНАК ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ

Студэнцкія гады – гэта перыяд найбольш інтэнсіўнай сацыялізацыі асобы, які значна ўплывае на яе фарміраванне і самаўдасканаленне. Знакаміты псіхолаг Б.Г.Ананьеў адзначаў, што гэты перыяд жыцця мае найважнейшае значэнне як асноўная стадыя сацыялізацыі, старт дзейнасці [1].

У гэтым кантэксце працэс станаўлення асобы студэнта звязаны з фарміраваннем яго прафесійнай культуры як цэласнай сістэмы, што адлюстроўвае адзінства асобасных і прафесійна значных характарыстык будучых спецыялістаў. Таму актуальным падаецца пытанне, звязанае з пошукам тых сістэмаўтваральных жыццёвых каштоўнасцей і сацыяльных арыентацый, якія на асобасна структурным узроўні будуць забяспечваць актыўную жыццёвую пазіцыю спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі. Мяркуецца, што такі патэнцыял асобы можа быць створаны на падставе фарміравання светапогляднай культуры суб'екта, стрыжнёвым элементам якой з'яўляюцца ідэалагічныя каштоўнасці. Светапогляд асобы – гэта заўсёды эмацыянальна насычанае, узбагачанае асобасным сэнсам стаўленне чалавека да навакольнага свету, грамадства, да самога сябе. Яно выконвае зыходную рэгулятыўную функцыю ў дзейнасці і паводзінах асобы пры выкананні ёю сваіх роляў грамадзяніна, працаўніка і сем'яніна.

Ідэалогія як "сістэма канцэптуальна-тэарэтычных поглядаў і ідэй, што склаліся гістарычна, а таксама эмацыянальна-псіхалагічных сродкаў, якія адлюстроўваюць асноўныя прыярытэты, інтарэсы, ідэі і ідэалы, каштоўнасці, праграмы вызначаных сацыяльных аб'яднанняў і арганізацый, нацый і дзяржаў, палітычных партый і грамадзянскіх рухаў" [2, с.7], выконвае накіра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вальную ролю ў светапоглядзе асобы і выступае неад'емнай часткай рэчаіснасці, адной са старонак духоўнага існавання нацыі. Таму відавочна, што нацыянальная культура як адлюстраванне непаўторнага светаўспрымання, стварэння унікальнай карціны свету на падставе гістарычнага поступу народа з'яўляецца важным кампанентам дзяржаўнай ідэалогіі.

Нацыянальны аспект дзяржаўнай ідэалогіі знаходзіць ўвасабленне ў нацыянальнай самасвядомасці асобы студэнта, яго нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Менавіта нацыянальная самасвядомасць забяспечвае ўспрыманне асобай студэнта сябе як неад'емнай часткі свайго народа, яго мінулага і сучаснага, яго будучыні, што пазітыўна ўздзейнічае на асобасна значнае засваенне нацыянальна-дзяржаўных ідэалагічных каштоўнасцей і стымулюе сацыяльную пазіцыю студэнта.

Навука разглядае нацыянальную самасвядомасць як складаную частку духоўнага жыцця нацыі і кожнага чалавека, у структурным аспекце якой выдзяляюцца такія элементы:

– усведамленне этнічнай супольнасці і адносін да іншых этнасаў;

– прыхільнасць да нацыянальных каштоўнасцей – мовы, тэрыторыі, культуры;

– разуменне агульнасці ў забеспячэнні развіцця і росквіту сваёй нацыі.

Адзначаныя характарыстыкі з'яўляюцца адлюстраваннем унутранага свету асобы, часткай яго "Я-канцэпцыі" і таму адыгрываюць вялікую ролю ў фарміраванні і рэалізацыі яе жыццёвай стратэгіі. Адначасова яны праз пачуццёва-эмацыянальныя адносіны раскрываюць асобасна ўспрынятую частку ідэалогіі, яе так званы скрыты план, звязаны з інтарэсамі і патрабаваннямі чалавека як адзінкі грамадства.

У фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці чалавека можна вылучыць кагнітыўны, эмацыянальны і паводзінскадзейнасны кампаненты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У практыцы падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе найбольш распаўсюджаным і распрацаваным выступае кагнітыўны аспект. Шырокі блок сацыяльна-гуманітарных дысцыплін забяспечвае фарміраванне фундаментальных ведаў будучага спецыяліста, дазваляе спасцігнуць шматлікія факты і падзеі з гісторыі і сучаснасці беларускага народа, вылучыць механізмы і заканамернасці яго развіцця, вывучыць умовы для забеспячэння паспяховага руху наперад. Вызначальнымі псіхалагічнымі працэсамі пры гэтым выступаюць успрыманне, увага, памяць, мысленне. Ствараючы кагнітыўнае поле, гэтыя механізмы не заўсёды патрабуюць ад студэнта суадносін атрыманых ведаў з асабаснай пазіцыяй, з эмацыянальнай насычанасцю гэтых фактаў і таму выступаюць толькі на ўзроўні рэпрадукцыі. Як следства, засвоены на такім узроўні матэрыял не дае падстаў для станаўлення нацыянальнай самасвядомасці асобы, а стварае толькі першы крок для далейшай дзейнасці, звязанай з эмацыянальнымі і дзейнаснымі формамі засваення і рэалізацыі матэрыялу.

Навуковыя даследаванні сведчаць, што ідэалогія і нацыянальная самасвядомасць як яе арганічны блок не могуць выканаць сваёй мабілізуючай і стымулюючай ролі, калі не будуць задзейнічаны іншыя механізмы, у прыватнасць асабасныя інтарэсы, каштоўнасці, погляды, перакананні, мэты канкрэтнага чалавека. Менавіта эмацыянальна-пачуццёвы, псіхалагічны ўзровень успрымання нацыянальна насычаных ідэалагічных канцэпцый забяспечвае глыбокае іх засваенне, пераўтварае ў прынцыпы ажыццяўленне розных відаў дзейнасці, і ў першую чаргу прафесійнай дзейнасці. Псіхалагічныя фактары ў дадзеным кантэксце выконваюць ролю асабасных стымулаў, ствараюць пераканаўчую аснову для актыўнасці студэнта ў навучальным працэсе. Таму не падлягае сумненню, што арганізацыя вучэбнай дзейнасці павінна будавацца на асабасна арыентаваным падыходзе, на актуалізацыі індывідуальнага вопыту студэнта, яго жыццёвых каштоўнасцей. У гэтых умовах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

высвятляецца асобасны сэнс успрымаемых ведаў, ствараецца перспектыва для самаразвіцця і самарэалізацыі будучых спецыялістаў, фарміруецца іх адказная прафесійная і жыццёвая пазіцыя.

Вызначальная роля асобасных кампанентаў у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў у вышэйшай школе абумоўлівае неабходнасць засваення методык і тэхналогій, якія забяспечваюць актывізацыю эмацыянальна-дзейнасных механізмаў. Маецца на ўвазе, што ў межах розных відаў і формаў навучання метадалагічнай асновай фарміравання нацыянальнай самасвядомасці будучых спецыялістаў з'яўляецца стварэнне спецыфічных умоў, у якіх студэнт будзе пагружаны не толькі ў прастору фактаў і з'яў, што адлюстроўваюць нацыянальны аспект дзяржаўнай ідэалогіі, але і зможа эмацыянальна перажываць змест атрыманых ведаў як каштоўнасць асабістай культуры. Пры гэтым стрыжнёвым момантам становіцца атмасфера пастаяннага духоўнага пошуку і маленькіх адкрыццяў і дасягненняў, перажыванне гістарычных падзей мінулага, сучаснага і магчымай будучыні як маючых дачыненне да асабістага жыцця з'яў. Важна памятаць, што найвышэйшы эфект можа быць дасягнуты ва ўмовах ажыццяўлення сумеснай дзейнасці і міжасобасных зносін студэнтаў, у працэсе якіх забяспечваецца даступнасць для ўсіх індывідуальнага вопыту кожнага і адчыненасць вопыту іншага для сябе. У выніку шматбаковага ўсведамлення праблем і перспектыў развіцця свайго народа студэнт пачынае адчуваць сябе актыўным ўдзельнікам іх вырашэння. Набыты такім шляхам новы сэнс гістарычных і сучасных рэалій свайго народа пры далейшым падмацаванні пераўтвараецца ў фундамент жыццёвых поглядаў і адносін, становяцца базай для паспяховай самарэалізацыі на падставе нацыянальнай самасвядомасці.

Першыя крокі ў гэтым кірунку студэнты робяць на занятках, калі стымулюецца іх дзейнасць па стварэнні самастойнага праекта сацыякультурнай праграмы, накіраванай на фарміра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне ў яе ўдзельнікаў неабходных для нацыянальнай самасвядомасці ведаў, адносін, пачуццяў, жаданняў. Набыццё навыкаў падрыхтоўкі, прэзентацыі, абароны свайго творчага бачання вырашэння задач нацыянальнага выхавання будучых удзельнікаў культурных праграм адбываецца ў працэсе калектыўнага абмеркавання аўтарскай пазіцыі ў вучэбнай групе. У працэсе сутыкнення пазіцый і меркаванняў удзельнікаў дыскусіі складваецца пазітыўны вопыт правядзення мэтанакіраванай ідэалагічнай работы, высвятляюцца здольнасці ўздзейнічаць на светапогляд слухачоў, знаходзіць формы аптымальнага ўцягнення ўсіх навучэнцаў у агульны культуратваральны працэс.

З улікам методыкі арганізацыі выхавання нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў неабходна зыходзіць з адзінства і ўзаемадапаўняльнасці ўсіх трох кампанентаў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці: кагнітыўнага, эмацыянальнага і паводзінска-дзейнаснага. Пры гэтым, на наш погляд, у адпаведнасці з сутнасцю і функцыямі самасвядомасці чалавека значна ўзрастае роля эмацыянальна-пачуццёвага аспекту як адлюстравання індывідуальных адносін асобы да лёсу свайго народа, да сябе як актыўнай адзінкі адзінага этнасу.

---

1. *Ананьев Б.Г.* О проблемах современного человекознания. – М.: Наука, 1977.

2. *Яскевич Я.С.* Становление идеологии белорусского государства и национальная идея: традиции и новации: учеб.-метод. пособие. – Мн.: РИВШ БГУ, 2004. – С.7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ